**III Майскія Віткаўскія чытанні**
**“Жыў на свеце дзед Васіль”**



*Кожны маленькі чытач хоча перамагчы ў конкурсе*

Дзіцячая бібліятэка аб’явіла конкурс на лепшага чытача часопіса “Вясёлка”.

Пераможцы конкурса былі прэміраваны паездкай у рэдакцыю любімага часопіса.

Дзеці пабывалі ў музеі свайго земляка, сустрэліся з пісьменнікамі Анатолем Зэкавым, Міколам Маляўкам, Міколам Чарняўскім. Аўтары пазнаёмілі юных гасцей са сваімі творамі, расказалі пра планы рэдкалегіі на далей і раздалі аўтографы на ўспамін. Дзеці сфатаграфаваліся з пісьменнікамі, прачыталі вершы Васіля Віткі, напісалі пажаданні часопісу.



*Пераможцы конкурса на лепшага чытача часопіса “Вясёлка” і арганізатары Чытанняў у рэдакцыі з галоўным рэдактарам У.Ліпскім*



*Паэт А.Зэкаў слухае верш В.Віткі ў выкананні юнай чытачкі*

На працягу Віткаўскага тыдня ва ўсіх бібліятэках прайшла акцыя “Дзень з Віткам”, якая ўключала тэатралізаваныя пастаноўкі, тэматычныя вечарыны, конкурсы, выставы і інш. Кульмінацыяй Віткаўскіх чытанняў стаў удзел юных случчан у творчым вечары пісьменніка Уладзіміра Ліпскага, які адбыўся ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. На вялікай сцэне дзеці ўручылі

прывітальны адрас юбіляру ад дзяцей Случчыны і падарункі, сярод якіх і букет бэзу з радзімы Васіля Віткі.

Не прамінулі слуцкія чытачы і рэдакцыю часопіса “Вясёлка”. І хоць яны “выраслі з часопіса”, але пазнаёміцца з сапраўднымі паэтамі было вельмі цікава.

Падобныя мерапрыемствы даюць магчымасць прачытаць і перачытаць цудоўныя творы Васіля



*Слуцкая дэлегацыя на сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі з юбілярам У.Ліпскім*



*Удзельнікі акцыі“Дзень з Віткам” з пісьменнікам А.Зэкавым*



*Дэлегацыя са Слуцка ў рэдакцыі часопіса “Вясёлка”, 2010 год*

Віткі і зразумець – гэта быў не толькі таленавіты пісьменнік, але і вельмі светлы чалавек, патрыёт сваёй зямлі, добры сябар хлопчыкаў і дзяўчынак.